# ПАЭТЫЧНЫ МАЛІТОЎНІК: ЛІРЫКА ПАЭТАЎ ВАЛОЖЫНШЧЫНЫ

***Р. І. Кароткі***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – Д. Я. Дрозд*

**Анатацыя.** У артыкуле вызначаюцца рэлігійныя матывы і вобразы, звязаныя не толькі з творчасцю пісьменнікаў Валожынскага раёну, але і з мастакамі слова, дзейнасць якіх звязана з абраным для даследавання рэгіёнам.

**Ключавыя словы:** Літаратурнае краязнаўства; Валожынскі раён; біблейска-філасофская лірыка; «паэтычны малітоўнік».

Валожын… Валожыншчына… Гасцінная зямля з жывапіснымі пагоркамі, квяцістымі сенажацямі, урадлівымі палеткамі льну і збажыны, пранізанымі ніткамі сучасных аўтастрад і прасёлкаў. Валожыншчына – грыбныя бары і пералескі, раскоша зялёных прысад ля кожнай вёскі. Хто быў на Валожыншчыне, добра памятае гучныя назвы тутэйшых мясцін – Існачоўка, Белакорац, Ракаў, Вішнева, Лоск…

Валожынская зямля багата не толькі прыродай, сваёй гісторыяй, але і людзьмі. Сярод паважаных землякоў, нямала вучоных, культурных, грамадскіх дзеячаў, военачальнікаў, славутых мастакоў і пісьменнікаў. З хваляваннем называем такія імёны, як Фердынанд Рушчыц, Міхал Агінскі, Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, Уры Фінкель… Пачэснае месца ў беларускай пісьменнасці займаюць Канстанцыя Буйло, Хведар Чэрня, Пятро Бітэль, валожынскі паэт, публіцыст, паплечнік Янкі Купалы па выданню «Нашай нівы», Стары Улас.

Беларуская грамадскасць ведае і нашых землякоў-сучаснікаў: прэзідэнта Ізраіля Шымона Пэрэса, дзяржаўнага дзеяча Вячаслава Кебіча, Героя Расіі Аляксея Бацяна, прафесара Вячаслава Рагойшу, паэта Віктара Шніпа, братоў Янушкевічаў. Яны горда нясуць званне «Валожынскія мы…»

Зямля беларуская, можа, і не такая багатая на карысныя выкапні ды мінералы, але пэўна, што яе багацце – мудрыя людзі. Маем права так сцвярджаць, прасочваючы гісторыю сваёй краіны, якая падарыла свету такіх вядомых людзей, як Мікола Гусоўскі, Сымон Будны, Янка Купала, кожны з якіх моцна любіў Беларусь. Гэту любоў яны выказвалі ў паэзіі, культурнай дзейнасці. Нам і цяпер ёсць, чым ганарыцца, ёсць за што і за каго маліцца.

Першым па храналагічным прынцыпе можна згадаць Святога Яцака Адравонжа. Існуе меркаванне , што святы Яцак мог нарадзіцца ў Яцкаве або Яго шляхі праходзілі праз гэты населены пункт Валожыншчыны. Адрывонж – маёнтак каля Вішнева. Гэта з’яўляецца сведчаннем таго, што святы Яцак мае

дачыненне да Валожыншчыны. Яго асабліва паважалі ў Кіеўскай Русі. У якасці прыклада прывядзем малітву да св. Яцака: «Св. Яцак, натхнёны апостал Славян, нястомны прапаведнік Слова, апякун развітога хрысціянства ў нашай Айчыне.

Усім сваім жыццём вучыў нас ушаноўваць Багародзіцу.

І сёння прыйдзі да нас з дапамогай і будзь апекуном, і сапраўдным накіроўцам да Бога і новай хрысціянскай развітасці.

Прывядзі новых, праз Бога прызваных людзей, якія зменяць аблічча старога свету справай або місіяй, якія распачаты, каб захацеў дапамагчы Хрыстос. Амэн» [3, с. 168].

Нельга не згадаць, што дзяды і бацькі Янкі Купалы недзе ў 1877 ці 1878 гадах арандавалі ў Івана Аляксандравіча Гаворкі маёнтак Камень, што ў Валожынскім раёне. Менавіта гэтую камяністую зямлю араў бацька Янкі Купалы Дамінік Луцэвіч, які ў 1879 годзе стаў мужам прыгажуні Бянігны Іванаўны Валасевіч. У 1881 годзе маладая сям'я Луцэвічаў працавала на бровары ў Паморшчыне, побач з Ракавам, у памешчыка Здзяхоўскага.

У Вішневе на Валожыншчыне ў 1891 годзе нарадзілася Уладзіслава Станкевіч, якой было наканавана лёсам пакінуць значны след на ніве народнай асветы і культуры, стаць вернай і нястомнай спадарожніцай нялёгкага жыцця Янкі Купалы, зрабіць усё магчымае, каб захаваць памяць пра мужа-паэта для нашчадкаў. У 1908 годзе ў рэдакцыі газеты «Наша ніва» Станкевічанку з Янкам Купалам пазнаёміў паэт-валожынец Стары Улас (Уладзіслаў Пятровіч Сівы-Сівіцкі). 23 студзеня 1916 года ў жыцці Уладзіславы Францаўны Станкевіч і Янкі Купалы адбылася значная падзея: яны сталі мужам і жонкай (у Маскоўскім Петрапаўлаўскім касцёле іх лёсы злучыліся на ўсё жыццё). Таму пэўным унёскам у малітоўнік Валожыншчыны можна лічыць верш паэта «Мая малітва», тэкст якога стаў хрэстаматыйным.

Міхась Курыла («белы птах Валожынскага краю» (Марыя Шык)) нарадзіўся 2 студзеня 1956 года ў в. Захвільцы Валожынскага раёна, скончыў Брылькоўскую васьмігодку, Сёмкава-Гарадокскую школу інтэрнат Мінскага раёна, філалагічны факультэт БДУ. Рэлігійнымі матывамі прасякнуты яго верш «Малітва за край»:

Зайду ў свой храм – на бераг рэчкі
Дастану – хлеб, пастаўлю – Свечкі,
Укленчу ў травы – памалюся
За лёс радзімай Беларусі.

Слоў лішніх неба не пачуе
Назад – у жыце заначую.
Нарву букет хмяльны валошак
І думаць буду аб харошым

Мая малітва – верш на памяць.
Нашчадкі штосьці ў ім падправяць.
Мне гэты свет – заўсёды новы,
Шапчу яму малітвы словы:
«Даруй грахі, ласкавы Божа.
Даруй і бедным, і заможным…»
Адзіны край у нас, адзіны!
Завецца коратка: Радзіма [2, с. 26].

Валянціна Груць-Русакевіч нарадзілася ў 1953 годзе ў в. Міхайлоўшчына на Ашмяншчыне, скончыла Міхайлоўшчынскую сярэднюю школу (1970), факультэт журналістыкі БДУ (1975). Яна таксама з'яўляецца аўтарам палымяных радкоў-заклікаў пра неабходнасць апекі над Беларуссю:

За мілую зямельку Беларусі
За гэтыя прасторы і людзей,
Якіх не знойдзеш болей анідзе
Да Неба шчыра, горача малюся.

Засцеражы, Ўсявышні, ад нягоды
Табой благаславёны ўжо куток –
Табой благаславёны ўжо куток
Жыцця майго аснову і выток,
Не пашкадуй дабра майму народу [1, с. 146].

В. Груць-Русакевіч нібыта працягвае традыцыі Францыска Скарыны, ствараючы акравершы-малітвы:

**Б**'ецца званочкам срэбным,
**О**, як звініць-спявае
**Ж**аўра ў світальным небе –
**А**буджае вітальна.
**Б**ліснулі праменні сонца –
**Л**ашчаць зямельку ветла,
**А** ў расяных кроплях
**Г**раюць-гараць самацветна.
**А** я шапчу ўсім сэрцам
**С**ловы малітвы шчырай
**Л**юбай маёй зямельцы
**А**б дабрыні і міры.
**В**еру, мой Божа, гэтак
**І** праз стагоддзі будзе –
**А**б тым да Цябе малюся:
**Д**ай жа святое веры!

**З**воніць няхай так срэбна
**І** абуджае ранне
**М**ілая птаха ў небе,
**У** аквамарыне світальным [1, с. 82].

Можна бясконца згадваць славутых прадстаўнікоў Валожыншчыны, якія стварылі своеасаблівы малітоўнік гэтага рэгіёну, але мы ў сваім артыкуле імкнуліся звярнуць увагу на асобныя, невядомыя шырокаму колу чытачоў старонкі літаратуры.

**Бібліяграфічны спіс:**


1. Гіруць-Русакевіч, В. Ф. Мовай сэрца : кніга паэзіі / В. Ф. Гіруць-Русакевіч.– Мінск : Маст. літ., 2008. – 158 с.
2. Курыла, М. Асенні рэнесан : вершы. – ЛМФ «Нёман», 2001. – 88 с.
3. Равінскі, Г. А. Млын жыцця // Г. А. Равінскі. – Мінск : Рым.-катал. парафія Св. Сымона і Св. Алены, 2004. – 396 с.


## ЖЛОБІНШЧЫНА ПРАВАСЛАЎНАЯ: ЛЯ ВЫТОКАЎ СТАНАЎЛЕННЯ


***В. Э. Літаш***
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», г. Мінск*

*Навуковы кіраўнік – І. М. Мішчанчук, кандыдат філалагічных навук, дацэнт*



**Анатацыя.** У артыкуле разглядаюцца асноўныя этапы станаўлення праваслаўя Жлобінскага раёну, апісваюцца знаходкі і артэфакты старажытных Радзімічаў канца І – пачатку ІІ тысячагоддзя нашага тысячагоддзя.



**Ключавыя словы:** радзімічы; Хрышчэнне; праваслаўе; курганы; краязнаўства.


Прывіваць любоў маладога пакалення да свайго народа трэба перш за ўсё з вывучэння гісторыі, культуры і літаратуры малой радзімы – горада ці вёскі, у дадзеным выпадку краязнаўства ў шырокім і вузкім сэнсе становіцца ланцужком, што звязвае тры часавыя вымярэнні: мінулае – сучаснасць – будучыню.

На заранку чалавецтва тэрыторыя маёй малой радзімы ўяўляла сабой дзікі, пакрыты дрымучымі лясамі і непраходнымі балотамі край, жыхары якога